## Жыццёвы каляндар

22.01.1940 – ў в. Рэкта Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці нарадзілася Лідзія Андрэеўна Мініч (паэтычны псеўданім Лідзія Андрэева);
1958 – з сярэбраным медалём скончыла СШ №3 г. Клімавічы;
1959-1964 – вучылася на зоатэхнічным факультэце Беларускай сельгасакадэміі (зараз факультэт біятэхналогіі і аквакультуры);
1964-1966 – працавала ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі г. Горкі;
1969 – скончыла аспірантуру ў БДСГА пры кафедры развядзення сельскагаспадарчых жывёл;
1971-1999 – працавала ў акадэміі асістэнтам, навуковым супрацоўнікам, старшым выкладчыкам, дацэнтам;
1989 – абараніла дысертацыю;
1994, 1998 – пераможца выкладчыцкага майстэрства сярод вышэйшых і сярэдніх вучэбных устаноў рэспублікі;
1990 – дэпутат Горацкага гарадскога Савета;
2013 – прынята ў рады ГА “Саюз беларускіх пісьменнікаў”;
2019 – пераможца абласнога этапу XI рэспубліканскага конкурсу “Жанчына года-2019” у намінацыі “Духоўнасць і культура” .

Першыя вершы Лідзіі Андрэевай з’явіліся на старонках газеты “Ленінскі шлях” у 1999 годзе. І з таго часу жыццё гэтай таленавітай жанчыны неразрыўна звязана з літаратурнай дзейнасцю. І хаця яе паэзія вельмі рознапланавая па форме і па зместу, можна з усёй упэўненасцю сказаць, што галоўны лейтматыў яе творчасці, які моцна, адкрыта і шчыра гучыць у творах Лідзіі Андрэевай – гэта любоў да Беларусі, сваёй маленькай радзімы, да роднай мовы. Для паэтэсы Бацькаўшчына з’яўляецца невычарпальнай крыніцай натхнення, і яна зноў і зноў нясе ёй сваю паэтычную споведзь на нашай, беларускай мове.













**“Любіць сваю Радзіму вучу я родным словам…”**




























У кожнага чалавека ёсць спадчына – яго зямля, яго Радзіма. Яе немагчыма ні аддаць, ні прадаць, ні падарыць – яе трэба любіць і рабіць так, каб гэтая спадчына свяціла добрым Святлом, бо водбліск яго – кожны з нас.

Жыццём азначаны і вершы –
Выток галоўных дзвюх ідэй:
Па значнасці, лічу, найпершым
Радзімы лёс і дух людзей!

Ты нарадзіўся,
каб век доўгі
жыць,
Любіць бацькоў,
Радзімай
даражыць.
Імя народ
ацэньвае
па справах:
“Якая справа –
вось такая й



Мой куток! Ты мяне не адрынь –
Працягні сваёй ласкі далоні,
Мне даруй і надзею пакінь –
Я чалом прыпадаю да ўлоння.

Землякі дарагія, сябры!
Вас я шчырай душой абдымаю,
Як вітаюць заўсёды бары, –
Мне здаецца, іх думы я знаю:

Дараць нам яны веру, спакой,
Добра зведаўшы буры і веі,
Бо засведчана моца з зямлёй
Каранямі глыбока, навекі.

Мой маленькі куток дарагі!
Абярэг ты да самага скону,
Вузел з продкамі самы тугі,
Дабраслаўлены Крыжам, Іконай.

Любоўю абдымаю

Да зары выйду з дому, на золку,
Каб убачыць як сонца ўстае,
Павітаць бы мне першаю толькі
Залатыя прасторы твае.

І такую ў сэрцы лагоду
Лье мне водар зямлі дарагой:
Я – твая ад спрадвечнага роду,
З беларускаю светлай душой.

Васільковы вяночак сплятаю –
Твой, Радзіма, пасаг берагу.
Я любоўю цябе абдымаю
І нашчадкам яе падару

І шапчу я каханню таемна:
“Ты не можаш мяне абмінуць -
Беларусь і любоў неад’емна
Ў маім сэрцы адзіна жывуць”.



“У сваім краі, як у раі” –
Так добра нам заўсёды ў ім,
Бо “дома сцены памагаюць” -
І цёпла тут нас сустракаюць.

Мяне мой Божа позна дапусціў
Паспрабаваці хлеб паэта,
Але я ўдзячная за гэта,
За ўсё , што Ён нам падарыў –
Жыццё, і мову, і Радзіму, –
Буду ўслаўляць, пакуль не згіну.

Хай вечна струменіць крыніца
І птушкі ляцяць, каб напіцца.
Узлётам на крылах надзейных
Па праву табе ганарыцца.
І песня раздольна пальецца,
А рэха наўкол адгукнецца:
“Красуй, акадэмія наша,
Няхай табе шчасна жывецца!”

